**Сяргей Чыгрын**
(Слонім)

## Дакументы Уладыслава Чаржынскага з архіва Казанскага медыцынскага ўніверсітэта

Беларускі літаратуразнавец, крытык, лексікограф і педагог Уладыслаў Чаржынскі (1897-1974) нарадзіўся на Беласточчыне ў вёсцы Стара-Каменная Сакольскага павета. Пачатковую адукацыю атрымаў у народным вучылішчы. Скончыў Мінскую гімназію і Белдзяржуніверсітэт. Працаваў настаўнікам на Лагойшчыне, а таксама выкладчыкам у Інстытуце беларускай культуры і ў Камуністычным універсітэце Беларусі. З 1922 г. пачаў выступаць з крытычнымі і літаратуразнаўчымі артыкуламі ў беларускім друку. З 1925 г. супрацоўнічаў з часопісам „Полымя”.

Уладыслаў Чаржынскі пад сваім уласным прозвішчам, а таксама пад псеўданімамі Ул. Дзяржынскі і Улідзе друкаваў сур’ёзныя артыкулы, у якіх даваў грунтоўны эстэтычны аналіз як асобных мастацкіх твораў, так і літаратурнага працэсу ў цэлым. Многія яго матэрыялы, прысвечаныя творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Міхася Чарота, Цішкі Гартнага, Янкі Журбы і іншых беларускіх пісьменнікаў, уражваюць і сёння глыбінёй і жывасцю даследчыцкай думкі, аргументаванасцю і пластычнасцю стылю. Працы Уладыслава Чаржынскага каштоўныя сёння яшчэ тым, што ў супярэчлівы і жорсткі час канца 1920-х гадоў у сваіх ацэнках ён кіраваўся эстэтычнымі крытэрыямі, а не вульгарна-сацыялагічнымі догмамі.

28 чэрвеня 1930 г. Уладыслаў Чаржынскі быў арыштаваны ДПУ БССР па справе „Саюза вызвалення Беларусі”. Па пастанове Калегіі АДПУ СССР ад 10 красавіка 1931 г. яго выслалі ў Казань тэрмінам на 5 гадоў. Праз 4 гады нашага земляка вызвалілі ад высылкі, але рэабілітавалі яго толькі пасля смерці ў 1988 г.

З Татарстана больш Уладыслаў Чаржынскі на Бацькаўшчыну не вярнуўся. Як сказаў Ігар Жук, «жыць на мяжы бездані, „не трапляючы ў яе”, ён навучыўся ў Казані, працуючы выключна на выкладчыцкіх пасадах у розных навучальных установах сталіцы Татарыі. Прорву, што ўтварылася „пяцігадовай высылкай”, а, як аказалася, здоўжылася на ўсё жыццё, пераступіць ён не пасмеў. Іншая і родная сталіца — Менск — аказалася для яго абазначэннем хісткай лёсавырашальнай мяжы, якую, пераступіўшы аднойчы ў адзін бок, назад ужо не адскочыш. Гэта было б вяртаннем у мінулае, а на этычным узроўні такое вяртанне для Чаржынскага не ўяўлялася магчымым»[1].

[1] Полымя, 1997, № 12.


СТ. ПРЕП.
ЧАРЖИНСКИЙ В.В.


Учебный корпус КГМИ

Так, Уладыслаў Чаржынскі дамоў больш не вярнуўся. Але ці поўнасцю адышоў ён ад літаратурнай і крытычнай дзейнасці — цяжка сказаць. Тым не менш, беларускімі пісьменнікамі і літаратурай ён моцна цікавіўся і тады, калі сорак гадоў жыў у сталіцы Татарстана.

Сёння ў архівах і музеях Казані захаваліся цікавыя звесткі пра нашага таленавітага і забытага земляка-літаратуразнаўца. Усе яны на рускай мове. Найбольш дакументаў захоўваецца ў асабістых справах Уладыслава Вікенцьевіча Чаржынскага ў архіве Казанскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Іх там дзве: адна за перыяд з 1933-1946 гг., другая за 1950-1971 гг., а таксама картачка Ф.Т-2. Знаёмства з некаторымі дакументамі хочацца пачаць з асабістага лістка па ўліку кадраў і характарыстыкі Уладыслава Чаржынскага.

**Личный листок по учёту кадров**

Фамилия — Чаржинский

Имя — Владислав

Отчество — Викентьевич

Пол — М

Год рождения — 1897

Место рождения — дер. Старокаменская Сокольского уезда Гродненской губ.

Национальность — белорус

Соц. происхождение — крестьяне

Основное занятие до Октябрьской революции — земледелие

Основная профессия — преподаватель

Соц. положение — служ.

Партийность — б/п

Состоял ли в других партиях — не состоял

Членом какого профсоюза состоит и с какого года — Медсантруд с 1934 г.

Образование — высшее

Подробное название высшего заведения — Белорусский государственный университет

Название факультета — этнолого-лингвистическое отд.

Дата поступления — 1921

Окончания — 1925

Какую узкую специальность получил в результате окончания учебного заведения — белорусский язык и литература

Учёная степень — нет

Был ли за границей — нет.

Характарыстыка на выкладчыка кафедры замежных моў Казанскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута Уладыслава Вікенцьевіча Чаржынскага дае поўнае ўяўленне, што гэта быў за выкладчык і чалавек наогул.

**Характеристика**

на преподавателя кафедры иностранных языков Казанского государственного медицинского института Чаржинского Владислава Викентьевича.


- 10 -

ХАРАКТЕРИСТИКА

на преподавателя кафедры иностранных языков Казанского государственного медицинского института ЧАРЖИНСКОГО Владислава Викентьевича.

ЧАРЖИНСКИЙ В.В., работавший преподавателем Казанского государственного медицинского института с 1/IX-1933г. и освобожденный от работы 1/VII-1947г. как совместитель, ввиду его основной работы в Казанском государственном стоматологическом институте, 1/IX-1950г. был опять зачислен преподавателем Казанского государственного медицинского института, где и работает в настоящее время.

Тов.ЧАРЖИНСКИЙ В.В., квалифицированный, опытный и дисциплинированный педагог, относится с любовью и усердием к своей работе.

Принимает активное участие в методической работе кафедры, выступал на заседаниях кафедры с докладами по вопросам методики преподавания языков.

ЧАРЖИНСКИЙ В.В. систематически занимается повышением своего идейно-политического уровня, активно участвует в занятиях, организованных для самостоятельно изучающих историю СССР преподавателей кафедры.

Постоянно работает над усовершенствованием своей производственной квалификации, принимает участие в работе кафедры над составлением пособия по немецкому языку для медиков.

Среди товарищей по работе и студентов тов.ЧАРЖИНСКИЙ В.В. пользуется заслуженным авторитетом.

Врид.Директора ин-та - /А.З.ЮСУПОВ/

Секретарь партбюро КГМИ - /КРАСИЛЬНИКОВ/

"5" марта 1952г.

Служебная характеристика на В.Чаржинского

Чаржинский В.В., работающий преподавателем Казанского государственного медицинского института с 1.09.1933 года и освобождённый от работы 1 декабря 1947 года как совместитель, ввиду его основной работы в Казанском государственном стоматологическом институте, 1.09.1950 года был опять зачислен преподавателем Казанского государственного медицинского института, где и работает в настоящее время. Тов. Чаржинский В. В., квалифицированный, опытный и дисциплинированный педагог, относится с любовью и усердием к своей работе. Принимает активное участие в методической работе кафедры, выступал на заседаниях кафедры с докладами по вопросам методики преподавания языков. Чаржинский В. В. систематически занимается повышением своего идейно-политического уровня, активно участвует в занятиях, организованных для самостоятельно изучающих историю СССР преподавателей кафедры. Постоянно работает над усовершенствованием своей производственной квалификации, принимает участие в работе кафедры над составлением пособия по немецкому языку для медиков. Среди товарищей по работе и студентов тов. Чаржинский В. В. пользуется заслуженным авторитетом.

**Врид. директора ин-та — А. З. Юсупов.**
**Секретарь партбюро КГМИ — Красильников.**
**5 марта 1952 г.**

У архіве Казанскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта захоўваецца і аўтабіяграфія Уладыслава Чаржынскага, напісаная яго асабістай рукой на рускай мове 27 красавіка 1943 г.

**Атобиография**
**преподавателя В. Чаржинского.**

Родился я в 1897 году в б. Гродненской губ., Сокольском уезде, дер. Старо-Каменная в семье крестьянина. У отца моего было 5 десятин земли, которую он обрабатывал сам лично при помощи своей семьи. Начальное образование я получил в начальном народном училище, по окончании которого поступил в Гродненскую казённую гимназию, где и обучался до 1914 года. Материальную помощь получал от старшего брата, находившегося на заработках в Америке. В 1915 году моя родина была оккупирована немецкими войсками. Я уехал в Ленинград, где и продолжал своё образование. В 1917 году я переехал в г. Минск и до 1920 года работал надомным учителем в Вилейском уезде. В 1921 году поступил в Белорусский государственный университет на этнолого-лингвистическое отделение, которое и окончил в 1925 году. Во время учёбы в университете, работал в Белорусском государственном издательстве и преподавал на рабфаке университета. С 1925 года работал в ка-

честве научного сотрудника в Институте белорусской культуры, а затем в Белорусской Академии Наук, в тоже время преподавал в Белорусском коммунистическом университете. В 1930 году я был административно выслан из Минска в г. Казань, сроком на пять лет. В Казани с 1931 до 1935 годов я работал методистом в Институте повышения квалификации учителей и в педагогическом институте. С 1933 года по совместительству работал преподавателем в Казанском государственном медицинском институте (до 1936 г.), а затем до 1940 года штатным преподавателем. С 1940 года штатную должность преподавателя занимаю в Казанском государственном стоматологическом институте, а в Казанском государственном медицинском институте работаю по совместительству.

**В. Чаржинский, 27.04.1943 г.**


Автобиография
преподавателя В. Чаржинского.

Родился я в 1897 г. в б. Гродненской губ. Сокольском уезде, дер. [illegible]-Каменная, в семье крестьянина. У отца моего было 5 десятин земли, которую он обрабатывал сам лично при помощи своей семьи. Начальное образование я получил в начальном народном училище, по окончании которого поступил в Гродненскую мужскую гимназию, где и обучался до 1914 г. Материальную помощь получал от старшего брата, находившегося на заработках в Америке. В 1915 г. моя родная семья эвакуировалась [illegible]. Я уехал в Ленинград, где и продолжил своё образование. В 1917 г. я переехал в г. Минск и до 1920 г. работал народным учителем в Витебском уезде. В 1921 г. поступил в Белорусский Государственный Университет, на Этнолого-Лингвистическое отделение, которое и окончил в 1925 г. Во время учёбы в университете работал в Белорусском государственном

Автобиография В. Чаржинского

Сярод выяўленых казанскіх дакументаў ёсць і „Перечень печатных трудов” Уладыслава Чаржынскага, які напісаны быў ім асабіста. Для чаго і для каго гэты „перечень” пісаўся — цяжка сказаць, але і ён захоўваеецца з 1933 г. у архіве Казанскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

**Перечень печатных трудов**

1. Поэтика литературных жанров. Пособие для техникумов и вузов. Белгосиздательство, 1927 г.
2. Учебник по истории белорусской литературы. Белгосиздательство, 1926 г.
3. Учебник по народной словесности, 1925 г.
4. Кратко-библиографический словарь, 1929 г.
5. Ряд научно-популярных текстов, печатаных отдельными брошюрами в 1925-1930 годах.
6. Ряд статей в „Литературной энциклопедии”.
7. Ряд статей в записках Белорусской Академии Наук (1928-1930 гг.).
8. Ряд статей-очерков в журналах „Адраджэньне”, „Полымя”, „Узвышша” и других.
9. Редактирование издания соч. Ленина на бел. языке и мн. др.

**В. Чаржинский, 20.10.1933 г.**

У архіве Казанскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта ёсць і цікавая выпіска з загада № 91 рэктара Казанскага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга медыцынскага інстытута імя С. В. Курашова ад 19 мая 1967 г. У ёй гаворыцца, што „в связи с 70-летием и 45-летием педагогической деятельности, из которых 35 лет отдано подготовке медицинских кадров в стаматологическом и медицинском институте г. Казани, за безупречную творческую работу, чуткое и принципиальное отношение к студентам старшему преподавателю В. В.Чаржинскому объявить благодарность с занесением в личное дело. Основание: предоставление зав. кафедрой К. Л. Раскина. Ректор института профессор — Х. Хамитов. Секретарь — Богданова”.

Дарэчы, у той час у Казанскіх медыцынскіх навучальных установах працавала вельмі многа ўраджэнцаў Беларусі, асабліва шмат было яўрэяў. Той самы Канэль Раскін быў родам з-пад Оршы, Ісак Алуф быў родам з Полацка і іншыя. Магчыма з іх дапамогай Уладыслаў Чаржынскі ў 1930-х гадах і ўладкаваўся да іх на працу.

У архіве Казанскага медуніверсітэта захоўваецца шмат розных выпісак з загадаў, пастаноў, распараджэнняў. Вось некаторыя з іх.

**Выписка**

из приказа № 145 директора Казанского гос. медицинского института от 14 ноября 1950 г.

Тов. Чаржинского В. В. зачислить преподавателем кафедры иностранных языков на полставки преподавателя с 1 ноября с.г. с окладом 675 руб. в месяц, как имеющему стаж работы больше 10 лет. Основание: Заявление т. Чаржинского с заключ. зав. каф. т. Фрейман и зав. отд. кадров т. Болгова.

**Врид. директора КГМИ — проф. Яснитский. Секретарь — Маслова.**

**Выписка**

из протокола заседания кафедры иностранных языков КГМИ от 4 марта 1971 года

Слушали:

1. Отчёт Чаржинского В. В. и заявление о том, что в связи с пенсионным возрастом он не будет претендовать на переизбрание.

Вагазова С. Л.: Чаржинскому В. В. рано уходить с кафедры, глубокие знания, умение не только учить студентов, но и передавать свой богатый опыт коллегам, ясный ум дают ему возможность продолжать работу.

2. Постановили: Принять к сведению заявление В. В. Чаржинского.

Председатель, зав. каф. ст. препод. — Раскин К. Л.

Секретарь — Халикова Г. Ф.

У чэрвені 1971 г. наш зямляк напісаў на імя рэктара заяву „вызваліць яго ад займаемай пасады ў сувязі з уходам на пенсію”. Тым больш, што яму ўжо было тады 74 гады. Рэктар задаволіў просьбу Чаржынскага.

**Выписка из приказа № 61-Л**

ректора Казанского государственного ордена Трудового Красного Знамени медицинского института имени С. В. Курашова от 30 июня 1971 года

Ст. преподавателя кафедры иностранных языков Чаржинского Владислава Викентьевича с 4 июля с.г. освободить от занимаемой должности в связи с уходом на пенсию. За долголетнюю, активную педагогическую, научную и общественную деятельность объявляю благодарность. Основание: заявление Чаржинского с резол. нач. отдела кадров Жирко Ф. Д.

**П. п. ректор института**
**профессор — Х. С. Хамитов. Секретарь — Богданова.**

У Казані Уладыслаў Чаржынскі пражыў яшчэ тры гады і 2 красавіка 1974 г. яго не стала.

**Siarhiej Czyhryn** — poeta, literaturoznawca, historyk regionalista, dziennikarz. Mieszka w Słonimiu, pracuje w redakcji „Gazety Słonimskiej”.